Краязнаўчы каляндар на 2026 год створаны на аснове энцыклапедычных выданняў: Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996 – 2004; Республика Беларусь: энцикл.: в 7 т. – Минск: БелЭн, 2005 – 2008; Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1992 – 1995; кніг: Памяць: гіст.-дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мінск: БелЭн, 2004; Тумаш, В. Культура зямлі Астравецкай: асобы і творы. – Мінск.: "Беларускі кнігазбор", 2000; Мальдис, А. Соотечественники: очерки о белорусах и уроженцах Беларуси, обогативших культуру. – Минск: Издательский дом "Звязда", 2013; Герои Советского Союза: краткий биографический словарь в 2 т., Т. 2. – Москва: Воениздат, 1988.

Акрамя гэтага, пры падрыхтоўцы каляндара выкарыстоўваліся матэрыялы з папкі краязнаўчага фонду бібліятэкі "Хто ёсць хто на Астравеччыне", а таксама артыкулы раённай газеты "Астравецкая праўда" 1980 – 2025 гг.

***У 2026 годзе спаўняецца*:**

**480 гадоў** спаўняецца з часу, як Кароль Жыгімонт II Аўгуст падараваў маёнтак Астравец разам з прыналежнымі да яго фальваркамі свайму двараніну Ярашу (Гераніму) Карыцкаму (**1546**). .

**195 гадоў** назад Астравеччына знаходзілася ў цэнтры паўстання 1830 – 31 гг. (**1831**).

**85 гадоў** пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Нямецка-фашысцкія захопнікі разбамбілі вучэбны аэрадром у Міхалішках (**22 чэрвеня 1941 года).**

**85 гадаў** назад Астравец быў акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі (**27 чэрвеня 1941 года**).

**105 гадоў Бацюлеву Анатолію Іванавічу,** удзельніку Вялікай Айчыннай вайны, заслужанаму работніку прамысловасці Беларусі (1984).

Нарадзіўся Анатоль Іванавіч ў 1921 годзе ў в. Колы Гарадокскага раёна Віцебскай вобласці. Працаваў у Свірскай раённай газеце, з 1959 года – на прамкамбінаце ў Астраўцы (у 1964 – 93 – дырэктар). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, “Знак Пашаны”, медалямі – дзвюма “За адвагу”, “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.”, “За ўзяцце Кёнігсберга”, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

**105 гадоў Трапшысу Станіславу Мікалаевічу**, кандыдату медыцынскіх навук.

Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Рымдюны Гервяцкага сельсавета. Вучыўся ў школах у Рымдзюнах і Гервятах. Скончыў Віленскую літоўскую гімназію, вучыўся ў Віленскім універсітэце. Пасля яго заканчэння прызначаны намеснікам старшыні ЦК Таварыства Чырвонага Крыжа Літвы. З 1956 г. працаваў галоўным урачом Вільнюскай клінічнай бальніцы. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ганаровымі граматамі.

**120 гадоў Менке Кацу**, яўрэйскагаму паэту.



Нарадзіўся ў 1906 г. у в. Міхалішкі. У 1920 г. выехаў у Амерыку. Працаваў align="left" рознарабочым.

Друкаваўся ў яўрэйскамоўных амерыканскіх газетах “Форвард” і “Фрайгайт”. Пасля вайны пісаў на англійскай мове, быў адзначаны амерыканскай літаратурнай крытыкай. Ён выдаў на ідыш і англійскай мовах 18 кніг, сярод якіх ёсць навуковыя працы.

Памёр 24 красавіка 1991 года.

**130 гадоў Валуевічу Міхаілу Міхайлавічу,** народнаму разьбяру па дрэву.

Нарадзіўся ў 1896 г. на хутары Глушыца Спондаўскага сельсавета. Працаваў сталяром у Літве, на лесанарыхтоўках у Карэліі. Жыў у Віцебску, Магілёве, Камянец-Падольску. У 1924 г. вярнуўся на радзіму.

Яшчэ ў дзяцінстве пачаў выразаць фігуркі і цацкі з драўляных нарыхтовак. З 1950-х г. займаўся разьбой у народным стылі. Шмат твораў прысвечана рэлігійнай тэматыцы. Творы разьбяра ўпрыгожваюць касцёлы, экспануюцца ў Гродзенскім музеі гісторыі рэлігіі.

Памёр 18 мая 1989 года.

**130 гадоў Лёнгіну Іванчыку,** святару, ксяндзу Клюшчанскай парафіі.

Нарадзіўся ў 1896 годзе ў Росенях. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю. Працаваў у Маладзечна з 1926 па 1928 год, а з 1928 па 1936 год – у Клюшчанах. Шмат увагі ўдзяляў рабоце з дзецьмі і моладдзю. Стварыў гурток польскай моладзі, гурток мастацкай самадзейнасці. Пры касцёле працавала бібліятэка, карыстацца якой маглі ўсе жадаючыя.

Ксёндз вёў урокі рэлігіі, пры школе арганізаваў дзіцячае згуртаванне “Круцыяты эўхарыстычнэ”.

У 1951 быў арыштаваны і сасланы ў Сібір на 10 гадоў. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

Памёр 26 кастрычніка 1976 года.

**1 лютага – 230 гадоў** з дня нараджэння **Брастоўскага Караля**, вынаходніка, рэфарматара.

Нарадзіўся 1.02.1796 г. у в. Міхалішкі. У 20 гадоў меў званне капітана інжынерыі і быў ад’ютантам вялікага князя Канстанціна, сына расійскага імператара Паўла І. Але паспяховую ваенную кар’еру мяняе на пастаяннае жыхарства ў глухой правінцыі – сядзібе Цісова Штабінскай воласці.

У 1824 годзе адмяніў паншчыну і даў волю сваім сялянам, а таксама права на арэнду сельскагаспадарчых земляў, садоў, лясоў і гаспадарчых будынкаў. Стварыў вясковае самакіраванне і пры ім касу ўзаемадапамогі, а таксама шэраг грамадска-сацыяльных устаноў.

Быў выдатным законатворцам. Уклаў “карны кодэкс”, дзякуючы якому большасцю галасоў вырашаліся ўсе канфліктныя сітуацыі паміж сялянамі.

У ваколіцах сядзібы разгарнуў прамысловую будоўлю: гарэлачны завод, піўны бровар, цагельню, тартак (пілараму), вятрак, вадзяны млын і гарбарню, дзе займаліся вырабам скур. Наладзіў металургічную вытворчасць і шкляную гуту. Праявіў сябе як выдатны вынаходнік машын і тэхнічных прыстасаванняў. У гаспадарцы выкарыстоўваліся зроблены ім самім даільны апарат, малочны сепаратар і машына для збірання бульбы. Шлюзы Аўгустоўскага канала зроблены на металургічным міні-заводзе графа Караля.

Змучаны інтэнсіўнай фізічнай працай, выехаў на лячэнне ў Парыж, дзе раптоўна памёр 25 ліпеня 1854 года.

У Сувалках у памяць пра графа да самага пачатку Другой сусветнай вайны існаваў агульнаадукацыйны ліцэй імя Караля Брастоўскага.

**16 лютага – 125 гадоў** з дня нараджэння **Мар’яна Богуша-Шышкі,** мастака.



Нарадзіўся Мар’ян 16.02.1901 г. ў маёнтку Трокенікі. Маляваць пачаў у 4 гады. Закончыўшы гімназію, вучыўся 3 гады выяўленчаму мастацтву ў Віленскім універсітэце, 4 гады – у Кракаўскай акадэміі. Выкладаў маляванне ў розных навучальных установах Польшчы.

У 1939 г. быў мабілізаваны ў польскую армію, удзельнічаў у 2-й сусветнай вайне, трапіў у палон і да заканчэння вайны знаходзіўся ў нямецкіх канцэнтрацыйных лагерах. Пасля вызвалення выехаў у Італію, дзе арганізаваў курсы па гісторыі мастацва.

З 1946 г. жыў у Англіі, кіраваў школай мальбертнага жывапісу. Памёр у 1995 годзе, не паспеўшы наведаць радзіму.

---

**6 сакавіка – 90 гадоў** з дня нараджэння **Александровіча Івана Францавіча.**

Нарадзіўся 6.03.1936 г. ў в. Варняны. Беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі хімічных валокнаў. Кандыдат тэхнічных навук.

**26 сакавіка – 95 гадоў** з дня нараджэння **Яцкевіча Мечыслава**, прафесара, грамадскага і культурнага дзеяча.

Нарадзіўся 26.03.1931 г. ў Іўеўскім раёне Гродзенскай вобласці. У час Другой сусветнай вайны жыў з маці ў Вільні, а потым у в. Кямелішкі, дзе вучыўся ў мясцовай школе.

У 1956 годзе выехаў з сям’ёй у Польшчу.

У 1965 годзе закончыў рускае аддзяленне філфака Варшаўскага ўніверсітэта. У 1969 годзе распачаў выкладанне русскай літаратуры ў Ольштынскім педінстытуце.

У 1998 годзе накіраваны на дыпламатычную работу – генеральным консулам Рэспублікі Польшча ў Вільнюсе. Пачынае працу над шматтомнай “Энцыклапедыяй Віленскай зямлі”.

Сваёй радзімай лічыць Астравецкі раён, таму арганізаваў супрацоўніцтва паміж Астраўцом і паветам Лідзбарк Варміньскі Ольштынскага ваяводства.

Узнагароджаны Залатым Крыжам Заслугі (1976), Кавалерскім Крыжам ордэна Адраджэння Польшчы (1979) і інш.

---

**5 красавіка - 65 гадоў з** дня нараджэння **Бялячыца Станіслава Пятровіча.**

Нарадзіўся 5.04.1961 г. ў в. Радзюшы-Тушча. У 1978 годзе скончыў Міхалішкаўскую сярэднюю школу, у 1979 годзе – курсы шафёраў пры Ашмянскім ПТВ.

4.11.1980 г. прызваны ў рады Узброеных сіл. З лютага 1981 года служыў вадзіцелем-электрамеханікам ў Афганістане ў вайсковай часці палявая пошта 94164. Радавы С. П. Бялячыц загінуў 1.08.1982 пры выканані баявога задання.

Пахаваны ў в. Завідзіненты.

---

**5 мая – 180 гадоў** з дня нараджэння **Сянкевіча Генрыха**, польскага пісьменніка.



Нарадзіўся 5.05.1846 г. ў Польшчы.

У 1880 годзе прыязджаў на Астравеччыну ў в. Дубнікі, дзе на ўскраіне вёскі знаходзіўся яго маёнтак. Тут ён працаваў над раманам “Пан Валадыеўскі” (1887-88), прысвечаным барацьбе з турэцкім нашэсцем 1672-73

гг. Сваякі і знаёмыя Г. Сянкевіча, што жылі ў вёсцы, сталі прататыпамі герояў яго твора. Тут у пісьменніка ўзнікла задума рамана “Патоп” (1884-86) пра вызваленчую барацьбу палякаў супраць шведскай інтэрвенцыі 1655-56 гг.

У 1905 годзе Г. Сянкевіч атрымаў Нобелеўскую прэмію.

Памёр 15 листапада 1916 года.

---

**2 ліпеня – 80 гадоў** з дня нараджэння **Цехановіча Яна Станіслававіча**, доктара навук, гісторыка, філосафа, філолага, публіцыста, рэлігіязнаўцы.

Нарадзіўся 2.07.1946 г. у Варнянах. Закончыў Варнянскую сярэднюю школу, Мінскі інстытут замежных моў. Некаторы час працаваў перакладчыкам у Акадэміі навук БССР.

З’яўляецца аўтарам звыш сарака навуковых прац, выдадзеных у Расіі, Беларусі, Польшчы, Літве, Германіі і ЗША. Сярод іх: “Філасофія каталіцызма”, шасцітомнік “Рыцарскія роды ВКЛ”, двухтомнік “Руска-польскі гербоўнік” і інш.

Працаваў выкладчыкам філасофіі ў Віленскім педагагічным інстытуце, быў абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

У 1992 годзе выехаў у Польшчу.

---

**8 жніўня – 80 гадоў** з дня нараджэння **Струмілы Славаміра Аляксандравіча,** доктара біялагічных навук, кандыдата медыцынскіх навук, прафесара.



Нарадзіўся 8.08.1946 г. у в. Слабодка Гудагайскага сельсавета. У 1963 г. скончыў Астравецкую сярэднюю школу, у 1969 г. – Гродзенскі медыцынскі інстытут. З 1971 года - навуковы супрацоўнік Аддзела абмену рэчываў АН БССР у

Гродне, кіраўнік лабараторыі. У 1975 г. у Вільнюсе абараніў кандыдацкую дысертацыю ў Інстытуце эксперыментальнай і клінічнай медыцыны, у 1985 г. – доктарскую ў Ленінградзе. З 1988 г. загадчык кафедры біяхіміі Гродзенскага медыцынскага інстытута, з 1991 г. - Беластоцкага філіяла Варшаўскага ўніверсітэта.

Жыве ў Польшчы.

**28 жніўня – 75 гадоў** з дня нараджэння **Александровіча Віктара Францавіча,** беларускага графіка.

Нарадзіўся 28.08.1951 г. у вёсцы Слабодка Гудагайскага сельсавета. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут і працаваў у станковай, кніжнай і часопіснай графіцы. Аформіў і праілюстраваў звыш 70 выданняў. Асноўныя працы – трыпціх “Цётка”, серыя гравюр па матывах паэм Янкі Купалы.

Узнагароджаны дыпломамі беларускіх, міжрэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў кнігі. Член Беларускага саюза мастакоў з 1985 г. Творы Віктара Александровіча знаходзяцца ў мінскіх музеях, прыватных калекцыях..

---

**10 кастрычніка – 95 гадоў** з дня нараджэння **Мальдзіса Эўгеніюша,** польскага графіка і скульптара.

Нарадзіўся 10.10.1931 г. ў в. Расолы. У 1946 г. сям’я выехала ў Польшчу, у г. Хошчна. Эўгеніюш Мальдзіс закончыў Вышэйшую мастацкую школу у Познані, дзе застаўся працаваць. Як графік удзельнічаў у міжнародных мастацкіх выстаўках у СССР, ГДР, Балгарыі, Югаславіі, Аўстрыі, Італіі, Англіі і інш. краінах. Атрымаў розныя прэстыжныя ўзнагароды. У сваёй творчасці часта звяртаецца да беларускай тэматыкі (графічны цыкл “Беларускія бабы”), успамінаў дзяцінства. Неаднаразова наведваў Астравеччыну, дзе ў в. Палушы захоўваюцца два яго творы.

Памёр 10 лютага 2009 года ў Польшчы.

**18 кастрычніка – 115 гадоў** з дня нараджэння **Стапанавічуса Юліёнаса**, літоўскага рэлігійнага дзеяча.

Нарадзіўся 18.10.1911 г. ў в. Міцюны Гервяцкага сельсавета. Вучыўся ў Гервяцкай пачатковай школе. У 1930 годзе скончыў літоўскую гімназію імя Вітаўта Вялікага, у 1936 годзе – Віленскую духоўную семінарыю, атрымаў ступень магістра тэалогіі.

Служыў капеланам у Гродзенскай польскай бернардзінскай школе для дзяўчынак, у 1939 годзе – плябанам у Палушы, потым у Літве. У 1955 годзе прызначаны біскупам у Вільнюс, адначасова з 1958 года выконваў абавязкі Апостальскага адміністратара Вільнюскай архіепархіі і Панявежскай епархіі.

У 1989 годзе ад папы рымскага Іаана Паўла ІІ атрымаў тытул архібіскупа і прызначаны ардынатарам Вільнюскай архіепархіі.

Памёр 18 чэрвеня 1991 года.

**22 кастрычніка – 90 гадоў** з дня нараджэння **Граблеўскага Івана Станіслававіча,** журналіста, публіцыста, краязнаўца.

Нарадзіўся 22.10.1936 г. ў в. Сакольнікі (зараз Філіпаны) Астравецкага раёна. Скончыў Філіпанскую, а ў 1955 годзе – Варнянскую сярэднюю школу.

Адслужыў у арміі на Крайняй Поўначы. Пасля вяртання працаваў карэктарам у газеце “Астравецкая праўда”. Перавялі ў Смаргонскую газету, праз год – намеснікам рэдактара ў Шчучын. Завочна закончыў факультэт журналістыкі БДУ. Разам з дыпломам атрымаў новае прызначэнне – рэдактарам Бераставіцкай раённай газеты.

З 1970 года – галоўны рэдактар абласнога тэлебачання і вядучы цыкла “Гродна і гродненцы”.

Аўтар кніг “Юныя героі Гродзеншчыны”, “Нёман – рака дружбы”, “Гродзенская вобласць” і “Гродна і ваколіцы”.

Узнагароджаны медалём “За доблесную працу”, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Памёр у 1994 годзе ў г. Гродна.



**11 лістапада – 70 гадоў** з дня нараджэння **Станіслава Віктаравіча Валодзькі**, беларускага паэта.

Нарадзіўся 11.11.1956 г. у в. Падольцы. У 1974 г. скончыў Жукойненскую сярэднюю школу. Першы верш "Вялікія" надрукаваны ў 1974 г. у газеце "Астравецкая праўда", потым былі публікацыі ў газеце "Чырвоная змена", часопісах Беларусь", "Маладосць" і інш. Скончыў філалагічны факультэт БДУ. Працаваў на чыгунцы ў Вільнюсе, потым у Даўгаўпілсе. Адзін з ініцыятараў стварэння ў Даўгаўпілсе беларускай грамадска-культурнай суполкі "Уздым".

**17 лістапада – 65 гадоў** з дня нараджэння **Блашкевіч Дануты Міхайлаўны,** заслужанага работніка культуры Беларусі (2001), выкладчыцы Астравецкай дзіцячай школы мастацтваў**.**

Нарадзілася 17.11.1961 г. у в. Груздоўшчызна Астравецкага раёна. Закончыла Астравецкую сярэднюю школу (у той час адзіную ў пасёлку) і музычную школу па класе акардэона. Скончыла Лідскае музычнае вучылішча (1981), Мінскі Інстытут культуры (1992). З 1981 года працавала выкладчыкам дзіцячай музычнай школы ў в. Варняны, з 1991 г. – у г.п. Астравец. Удзельніца і прызёр занальных і абласных конкурсаў мастацкай самадзейнасці ў намінацыі "Народныя спевы".



*У 2026 годзе адзначаецца:*

**355 гадоў** з часу заснавання **касцёла Святога Георгія (Юрыя) у в. Вялікія Свіранкі (1671).**.

**245 гадоў** назад Станіславам Прушчынскім быў фундаваны драўляны **касцёл Нараджэння Багародзіцы ў в. Кямелішкі (1781)**.

**240 гадоў** назад быў заснаваны **касцёл Святога Яўхіма ў в. Клюшчаны (1786).**

**115 гадоў** назад пабудаваны **касцёл Узнясення Святога Крыжа ў Астраўцы (1911).**

**85 гадоў** назад выйшаў першы нумар газеты "Бальшавіцкі арганізатар" **(25 мая 1941 года).** З **1 ліпеня 1956 года** газета – **"Астравецкая праўда".**

**80 гадоў** назад Астравецкая сямігодка рэарганізавана ў сярэднюю школу **(1946).**

**80 гадоў** назад была адкрыта Альхоўская сярэдняя школа **(1946 г.).**

**60 гадоў** назад быў арганізаваны Астравецкі лясгас **(7 ліпеня 1966 года).**

**55 гадоў** назад была адкрыта сучасная Астравецкая сярэдняя школа № 1 **(1971 г.)**

**30 гадоў** назад адкрыты Рымдзюнская сярэдняя школа з літоўскай мовай навучання і Рымдзюнская сярэдняя школа з беларускай мовай навучання **(1996).**

**25 гадоў** назад быў адкрыты Цэнтр культуры, адукацыі і інфармацыі ў Рымдзюнах **(18 сакавіка 2001 года).**

## *Юбілеі з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах паселішчаў Астравеччыны*

**635 гадоў** в. Варняны **(1391).**
**565 гадоў** в. Трашчаны **(1461)**
**510 гадоў** в. Сакалойці **(1516)**
**500 гадоў** в. Дрэвянікі **(1526)**
**480 гадоў** в. Вялікія Якентаны **(1546).**
**480 гадоў** в. Дайлідкі **(1546)**
**475 гадоў** в. Ажуройсці **(1551).**
**470 гадоў** в. Паракіці **(1556)**
**465 гадоў** в. Косцевічы **(1561)**
**435 гадоў** в. Кісялі **(1591)**
**435 гадоў** в. Масцяны **(1591)**
**430 гадоў** в. Міжаны **(1596)**
**245 гадоў** в. Шунэлішкі **(1781)**
**165 гадоў** в. Гадзілуны **(1861).**
**165 гадоў** в Жарнэлі **(1861)**
**165 гадоў** в. Ігнацова **(1861)**
**165 гадоў** в. Караняты **(1861)**
**165 гадоў** в. Кланішкі **(1861)**
**165 гадоў** в. Ліпкі (Варнянскі сельсавет) **(1861).**
**165 гадоў** в. Падваранцы **(1861)**
**165 гадоў** в. Петраполь **(1861)**
**165 гадоў** в. Пільвіны **(1861)**
**165 гадоў** в. Побалі **(1861)**
**165 гадоў** в. Повакша **(1861)**
**105 гадоў** в. Новыя Якентаны **(1921)**
**105 гадоў** в. Субялі **(1921).**